


# Анна Ахматава

## Выбраныя вершы

п

*паэты планеты*



# Анна Ахматава

## Выбраныя вершы

*Пераклад з рускай*
*Георгія Ліхтаровіча*

Мінск
Выдавец Зміцер Колас
2020

ББК 84(4Рус)-5
УДК 821.161.1-1
А95

Серыя заснаваная ў 2016 годзе.

Рэдкалегія серыі:

Л. Баршчэўскі, Зм. Колас, І. Крэбс,
А. Хадановіч, Г. Янкута

Пераклад зроблены паводле выдання:
Анна Ахматова. *Малое собрание сочинений.*
Санкт-Петербург: Азбука, 2016.

На вокладцы:

*К. Пятроў-Водкін,*
*Партрэт Анны Ахматавай (1922).*

**ISBN 978-985-23-0117-6**

©Дызайн серыі. Русецкі М. І., 2016.
©Афармленне. Выдавец Зміцер Колас,
2020.

## З КНІГІ «ВЕЧАР» (1912)

### *Любоў*

*(Любовь)*

То змейкай утульным клубком
Ля самага сэрца чаруе,
То цэлыя дні галубком
На белым акенцы буркуе,

То блісне ў замёрзлай вадзе
Ці здасца ў дрымоце ляўконій...
Ды верна й таемна вядзе
Ад радасці і ад спакою.

Умее салодка рыдаць
Скрыпічнай малітвай няўцешнай,
І страшна яе адгадаць
Яшчэ ў незнаёмай усмешцы.

*1911*

***

*(«И мальчик, что играет на волынке...»)*

І хлопчык той, што дзьме ў дуду старанна,
І дзеўчанё, што свой пляце вянок,
І сцежкі дзве, што ў лесе скрыжаваны,
І зніч у полі, што лагодзіць змрок, –

Мне бачна ўсё. Я ўсё запамінаю,
Любоўна-ціха ў сэрцы берагу.
Ды аднаго ніколі я не знаю
І ўспомніць нават болей не магу.

Я не прашу ні мудрасці, ні сілы.
Каб сон мой ля агню сагрэцца мог!
Мне холадна... Крылаты ці бяскрылы,
Не прыйдзе да мяне вясёлы бог.

*1911*

## *Песня апошняй сустрэчы*

*(Песня последней встречи)*

У грудзях пры хадзе халадзела,
Але крокі, нібы матылькі.
Не на тую руку я надзела
Пальчатку з левай рукі.

Падалося: прыступак многа,
А я ж ведала – іх толькі тры!
Шэпт між восеньскіх явараў строга
Папрасіў: «Са мною памры!

Я падмануты лёсам панылым,
Гэткай зменлівай доляй сваёй».
Адказала я: «Мілы, мілы!
Я таксама. Памру з табой...»

Гэта песня апошняй сустрэчы.
Я зірнула на цёмны дом.
Толькі ў спальні гарэлі свечкі
Абыякава-жоўтым агнём.

*1911*

***

*(«Мне с тобою пьяным весело...»)*

Мне з табою п’яным весела –
Сэнс губляеш ты ў расказах.
Восень ранняя развесіла
Жоўтыя сцягі на вязах.

У краіну мы хлуслівую
Забрылі і горка каемся,
Ды навошта ўсмешкай дзіўнаю
І застылаю ўсміхаемся?

Лёсу праглі мы пакутнага
Заміж шчасця бесклапотнага...
Не пакіну я бяспутнага
Сябрука свайго пяшчотнага.

*1911*

***

*(«Жарко веет ветер душный...»)*

Спёка. Дзьме задушны ветрык,
Сонца рукі апякло,
Нада мною столь з паветра,
Сіняга, як тое шкло;

Суха пахнуць імартэлкі,
Размяталася каса.
На камлі нязграбнай елкі
Мурашыная шаша.

Лёс палёгкай серабрыцца,
Як вадзіца, што ў стаўку...
І хто ж сёння мне сасніцца
Ў тым стракатым гамаку?

*1910*

***

*(«Ты поверь, не змеиное острое жало...»)*

Ты павер, не змяінае вострае джала,
А туга маю выпіла кроў.
Ў белым полі я ціхай дзяўчынаю стала,
Спевам птушкі я клічу любоў.

І здаўна мне закрыта дарога другая,
Мой царэвіч у вышнім крамлі,
Ці змагу падмануць, ці змагу я? – Не знаю!
Толькі зманам жыву на зямлі.

Не забыць, як прыйшоў ён са мной развітацца,
Я не плакала: гэта мой лёс.
Варажу, каб магла ў снах ягоных з'яўляцца,
Ды ўся магія вартая слёз.

Ці таму яго сон ціхамірна знясілеў,
Што зачынены брамы мае,
Ці пяшчотная і светлавокая Сірын
Над царэвічам песні пяе?

*1912*

## ***Шэравокі кароль***

*(Сероглазый король)*

Слава табе, безвыходны мой боль!
Раптам памёр шэравокі кароль.

Восеньскі вечар сваё дажываў,
Муж мой вярнуўся і ціха сказаў:

«Знаеш, яго каля дуба знайшлі
На паляванні, дзе ўчора былі.

І каралева ад гэткай бяды
Ў ноч пасівела... Такі малады!..»

Люльку сваю на каміне знайшоў
І на работу начную пайшоў.

Зараз дачку я сваю пабуджу,
Ў шэрыя вочкі яе пагляджу.

А за вакном шэпт начнога галля:
«Болей не ўбачыш свайго караля...»

*1910*

## ***Ён любіў...***

*(Он любил...)*

Ён любіў тры рэчы на свеце:
На вячэрні спевы, белых паўлінаў
І сцёртыя мапы Амерыкі.
Не любіў, калі плачуць дзеці,
Не любіў гарбаты малiннай
І жаночае істэрыкі
...А я жонкай ягонай была.

*1910*

***

*(«Сегодня мне письма не принесли...»)*

А сёння не прынеслі мне пісьма:
Забыў ён напісаць ці, можа, з’ехаў;
Вясна, як серабрысты пошчак смеху,

Шмат караблёў на рэйдзе нездарма.
Ды сёння не прынеслі мне пісьма...

Ён быў са мной зусім яшчэ нядаўна,
Такі пяшчотны, закаханы – мой,
Было ўсё гэта белаю зімой,
Але вясновы сум атрутны яўна.
Ён быў са мной зусім яшчэ нядаўна...

Я чую: трапяткі смычок прыціх,
Ад жудаснага болю б’ецца, б’ецца
І страшна мне, што сэрца разарвецца,
Не дапішу радкоў пяшчотных тых...

*1912*

## *Надпіс на няскончаным партрэце*
*(Надпись на неоконченном портрете)*

О, не ўздыхайце вы па мне,
Журба злачынна і дарэмна,
Я тут, на шэрым палатне,
Узнікла дзіўна і няпэўна.

Згін рук, што пачалі ўзлятаць,
І ўсмешка шалае лагоды,
Я іншай не магла паўстаць
Прад горкім часам насалоды.

Адно ён даць загад хацеў
Чужымі словамі і злымі.
Мой рот трывожна пунсавеў,
І шчокі сталі снегавымі.

Няма граху ў яго віне,
Глядзіць у вочы ён другія,
Ды аніўто не сніцца мне
Ў перадсмяротнай летаргіі.

*1911*

# З КНІГІ «РУЖАНЕЦ» (1914)

***

*(«Я не любви твоей прошу...»)*

Я не любві тваёй прашу.
Цяпер яна ў надзейным месцы.
Павер, што я тваёй нявесце
Лістоў раўнівых не пішу.

Ды мудрыя ёсць запаветы:
Дай вершы ёй чытаць мае,
Дай берагчы мае партрэты, –
Ласкавых жаніхоў стае!

Ды для дурніц найлепшы плён –
Цень перамогі безумоўнай,
А не сяброўскія размовы
І памяць першых светлых дзён...

Калі шчаслівыя грашы
Змарнуеш ты з сяброўкай мілай
І перасычанай душы
Ўсё стане раптам апастылым –

Ты ва ўрачысты час начы
Больш не прыходзь. Цябе не знаю.
І чым табе дапамагчы?
Ад шчасця я не ацаляю.

*1914*

***

*(«Столько просьб у любимой всегда!..»)*

Столькі просьбаў у любай заўжды!
У разлюбленай іх не бывае.
Як я рада, што жвавасць вады
Пад празрыстым лядком замірае.

І я стану – Хрыстос, памажы! –
На цалік гэты, светлы і крохкі,
А ты пісьмы мае беражы,
І нашчадкаў прысуд будзе лёгкі,

Каб выразней, дакладней, ясней
Ты быў бачны ім, мудры ды смелы.
У тваім жыццяпісе далей
Ці магчыма пакінуць прабелы?

Надта смачна нас поіць зямля,
Надта моцны любоўныя сеці.
Хай маё калі-небудзь імя
Разбяруць у падручніку дзеці,

І, пазнаўшы журбу нашых спраў,
Хай яны пасміхнуцца ласкава...
Ты любві мне й спакою не даў –
Дай хоць каліва горкае славы.

*1912(?)*

## *Бяссонніца*

*(Бессонница)*

Мяўканне знядоленае кошчына,
Гукі крокаў я здалёк лаўлю...
Калыханкі з тваіх слоў харошыя:
Трэці месяц я ад іх не сплю.

Ты ізноў, ізноў са мной, бяссонніца!
Нерухомы твар твой пазнаю.
Што, мая красуня беззаконніца,
Хіба дрэнна я табе пяю?

Вокны белым вэлюмам завешаны,
Сінь сутоння ўецца нада мной...
Ці далёкай вестачкай мы ўсцешаны?
Ну чаму так лёгка мне з табой?

*1912*

## ***Споведзь***

*(Исповедь)*

Змоўк, хто прабачыў мне грахі.
Ліловасць свечак у цямрэчы...
І цёмная епітрахіль
Акрыла галаву і плечы.

Ці той жа голас: « Панна! Ўстань...»
Грукоча сэрца й замірае.
І дотык праз тканіну – глянь:
Рука рассеяна жагнае.

*1911*

***

*(«Сердце бьется ровно, мерно...»)*

Сэрца б’ецца роўна, мерна.
Што мне доўгія гады!
Там, пад аркай на Галернай,
Нашы цені назаўжды.

Хоць замружаны павекі,
Бачу, бачу: ты са мной,
І ў руцэ тваёй навекі
Нераскрыты веер мой.

Ці таму, што сталі блізка
Мы ў шчаслівы міг дзівос,
Па-над Летнім садам нізка
Месяц ружаю ўваскрос, –

Мне не трэба больш чаканняў
Ля абрыдлага акна
І пакутлівых спатканняў.
Сніла я любоў адна.

Ты свабодны, я свабодна,
Заўтра – лепшая пара, –
Над Нявою цемнаводнай,
Пад усмешкаю халоднай
Імператара Пятра.
*1913*

***

*(«Я пришла к поэту в гости...»)*

*Аляксандру Блоку*

Я прыйшла к паэту ў госці.
Дня сярэдзіна. Нядзеля.
У прасторнай зале ціха,
А за вокнамі мароз.

І малінавае сонца
Над кудлатым шызым дымам...
Як жа гаспадар маўклівы
Светла на мяне глядзіць!

У яго такія вочы,
Што запомніць кожны мусіць;
Мне ж найлепей, асцярожнай,
Не глядзець у іх зусім.

Ды запомніцца размова,
Дымны поўдзень у нядзелю
Ў доме шэрым і высокім
Ля марскіх варот Нявы.

*1914*

# З КНІГІ «БЕЛАЯ ЧАРАДА» (1917)

***

*(«Думали: нищие мы, нету у нас ничего...»)*

Думалі: мы жабракі, і ў нас нічога няма,
Пачалі ж як адно за другім губляць,
Аж зрабіўся нам кожны дзень
Памінальным днём, –
Песні ўзяліся складаць
Аб вялікай шчодрасці Боскай
Ды аб нашым былым багацці.

*1915*

***

*(«Я улыбаться перестала...»)*

А я ўсміхацца перастала,
Марозны вецер вусны студзіць,
Адной надзеяй меней стала,
Адною песняй болей будзе.
І гэту песню я міжволі
Аддам на смех і ганьбаванне,
Бо для душы нясцерпным болем
Гучыць любоўнае маўчанне.

*1915*

***

*(«Есть в близости людей заветная черта...»)*

*М. У. Н[едабраво].*

У блізкасці людзей ёсць верная мяжа,
Яна для закаханасці і жарсці, –
Хай вусны ў цішыні зліваюцца й дрыжаць
І сэрца рвецца ад любві на часткі.

Сяброўства тут бяссільнае й гады
Высокага і полымнага шчасця,
Калі душа не ведае бяды
Маруднай млосці ад салодкай страсці.

Хто крочыць к ёй – вар'яцтва сняць сваё,
А хто дайшоў – ахоплены тугою...
Цяпер ты зразумеў, чаму маё
Не б'ецца сэрца пад тваёй рукою.

*1915*

***

*(«Ведь где-то есть простая жизнь и свет...»)*

А дзесьці ёсць жыццё, святло і свет
Празрысты, цёплы і вясёлы...
Там з дзеўчынаю цераз плот сусед
Пад вечар гутарыць, і чуюць толькі пчолы
Пяшчотны і прыцішаны дуэт.

А мы жывём святочна й гарапашна,
Шануючы абрады горкіх стрэч,
Калі з налёту вецер безразважны
Рве гутарку, каштоўнейшую рэч.

Ды ні на што не прамяняем пышны
Гранітны горад славы і бяды,
Шырокіх рэк бліскучыя ільды,
Бяссонечныя, змрочныя сады
І ціхі голас Музы ўвішнай.

*1915*

***

*(«Столько раз я проклинала...»)*

Колькі раз я праклінала
Гэта неба, гэту глебу,
І млына старога рукі,
Што махаюць гэтак цяжка!
Там, у флігелі нябожчык,
Ён сівы ляжыць на лаве,
Як і тры гады назад.
Мышы стала точаць кнігі,
Хіліць полымя налева
Стэарынавая свечка.
І пяе, пяе абрыдлы
Шаргунок ніжагародскі
Спеў свой просты, нескладаны
Весялосці маёй горкай.
Размалёваныя ярка
Ў рад шыхтуюцца вяргіні
Ўздоўж сярэбранай сцяжынкі,
Там, дзе ў слімаках палын.
Здарылася, што няволя
Стала мне другой радзімай,
А пра першую баюся
І ў малітве прыгадаць.

*1915*

***

*(«Буду тихо на погосте...»)*

Буду ціха на пагосце
Пад дубовай дошкай спаць,
Будзеш, мілы, к маме ў госці
Па нядзелях прыбягаць –
Цераз рэчку, цераз горку,
Што дарослым не дагнаць,
І здалёку, хлопчык зоркі,
Будзеш крыж мой пазнаваць.
Знаю, мілы, можаш мала
Пра мяне ты ўспамінаць:
Не ўшчувала, не ласкала,
Не вадзіла прычашчаць.

*1915*

***

*(«Будем вместе, милый, вместе...»)*

Будзем разам, мілы, разам,
Што мы родныя, ўсе знаюць,
А падступныя насмешкі,
Быццам шаргунок далёкі,
І пакрыўдзіць нас не могуць
І не могуць засмуціць.

Дзе вянчаліся – не помнім,
Ды царква ярчэла гэта
Тым неверагодным ззяннем,
Што адно анёлы здольны
Ў белых крылах несці нам.

А цяпер пара такая,
Страшны год і страшны горад.
Як жа можна разлучыцца
Мне з табой, табе са мной?

*1915*

***

*(«Перед весной бывают дни такие...»)*

*Н. Г. Чулковай*

Бываюць напрадвесні дні такія:
Пад шарпаком адпачывае луг,
Шапочуць дрэвы весела-сухія,
Пяшчотны ветрык, цеплыня наўкруг.

І лёгкасці здзіўляецца ўсё цела,
І дома ты свайго не пазнаеш,
І песню, што калісьці недапела,
Як новую, узрушана пяеш.

*1915*

***

*(«Выбрала сама я долю...»)*

Выбрала сама я долю
Сябру сэрцайка майго:
Адпусціла я на волю
Ў Дабравешчанне яго.

Ды вярнуўся голуб шызы,
У акенца б'е крылом.
Быццам бляск дзівоснай рызы
Ахінуў пакой святлом.

*1915*

***

*(«Долго шел через поля и сёла...»)*

Доўга йшоў цераз палі ды сёлы,
Йшоў, запытваў у людзей:
«Дзе яна, дзе бляск вясёлы
Шэрых зор – яе вачэй?

Надышлі ж і цьмяна палымнеюць
Дні апошнія вясны.
І часцей я сню, і ўсё святлеюць
Пра яе хвалюючыя сны!»

І прыйшоў у горад сумны
Ў адвячорка ціхі час,
Аб Венецыі падумаў
І аб Лондане, ураз.

Ля царквы стаў цёмнай і спічастай
На гранітны лесвіцы сувой
І маліў пра наступленне часу
Стрэчы з першай радасцю сваёй.

А над смуглым золатам прастола
Разгараўся Боскі сад ярчэй:
«Тут яна, тут бляск вясёлы
Шэрых зор – яе вачэй».

*1915*

***

*(«Еще весна таинственная млела...»)*

Яшчэ вясна загадкавая млела,
Празрысты вецер волю нёс гарам
І возера глыбокае сінела –
Хрысціцеля нерукатворны храм.

Спалохаўся ты першае сустрэчы,
А я ўжо лёс маліла аб другой, –
І маем сёння зноў гарачы вечар...
Як нізка сонца стала над гарой...

Ты не са мной, ды гэта не растанне:
Я кожны міг гатова святкаваць.
Ды знаю, што табе так скрушна стане,
Што й слова ты не зможаш мне сказаць.

*1917*

***

*(«Город сгинул, последнего дома...»)*

Горад згінуў, апошняга дома,
Як жывое, зірнула акно...
Гэта месца зусім незнаёма,
Змрок наўкол, пахне гарам яно.

Ды калі навальніцы завесу
Месяц так нерашуча рассек,
Мы заўважылі: цяжка да лесу
Чыкільгае-брыдзе чалавек.

Было боязна, што абганяе
Тройку коней сваёю хадой.
Пастаіць, потым зноўку кульгае
Пад уласнай паклажай цяжкой.

Мы заўважыць амаль не паспелі,
Як ён побач з кібіткай паўстаў.
Вочы, што тыя зоркі, сінелі,
Іхні бляск твар яму асвятляў.

Я к яму працягнула дзіцёнка,
Ён руку ўзняў, дзе след кайданоў,
І сказаў мне прыхільна і звонка:
«Будзе сын твой і жыў, і здароў!»

*1916*

## З КНІГІ «ТРЫПУТНІК» (1921)

***

*(«Просыпаться на рассвете...»)*

Прачынацца на дасвецці
Ад таго, што душыць радасць,
І глядзець ў акно каюты
На зялёную ваду
Ці на палубе ў нягоду
Футрам пухкім захінуцца,
Чуць, як грукае машына,
І не думаць ні аб чым,
Ды, прадбачачы спатканне
З тым, хто стаў маёю зоркай,
Ад салёных пырскаў ветру
Штогадзінна маладзець.

*1917*

***

*(«И в тайную дружбу с высоким...»)*

І ў дружбы таемства з высокім,
Як юны арол цёмнавокім,
Нібыта ў прадвосеньскі кветнік,
Я лёгкай хадою ўвайшла.
Былі там апошнія ружы,
І гойдаўся месяц празрысты
На шэрых аблоках густых...

*1917*

***

*(«Я спросила у кукушки...»)*

У зязюлі я спытала,
Колькі год я пражыву...
Хвоя веццем пахістала,
Промень паджаўціў траву.
Ды ні гуку ў росных нетрах...
Я іду дамоў,
Лашчыць мне халодны ветрык
Лоб гарачы зноў.

*1919*

***

*(«В каждых сутках есть такой...»)*

Смутны ў кожных сутках свой
Час марнеючых начэй.
Гучна гавару з тугой,
Не расплюшчваю вачэй.
І пульсуе, быццам кроў,
Подыхам свайго цяпла,
Як шчаслівая любоў,
Поўная развагі й зла.

*1916 <?>*

***

*(«Я окошка не завесила...»)*

Я вакенца не завесіла,
Проста ў мой пакой глядзі.
І таму мне сёння весела,
Што не можаш ты пайсці.
Называй жа беззаконніцай,
Кпі ды здзекуйся са зла:
Я была тваёй бяссонніцай,
Я тугой тваёй была.

*1916*

***

*(«Чем хуже этот век предшествующих? Разве...»)*

Чым гэты век ад папярэдніх горшы? Хíба
Адно, што ў чадзе смутку і трывог
Да чорнай язвы дакрануўся ён з агідай,
Ды вылечыць яе не змог.

Яшчэ на захадзе зямное сонца свеціць
І дахі гарадоў пад промнямі блішчаць,
А тут і белая дамы крыжамі меціць
І кліча крумкачоў, і крумкачы ляцяць.

*1919*

## *Ноччу*

*(Ночью)*

Стаіць на небе месяц, ледзь жывы,
У плыннай аблачынкавай мярэжы,
І ля палаца змрочны вартавы
Цікуе за гадзіннікам на вежы.

Няверная кабета йдзе дамоў,
Твар у яе задумлівы ды строгі,
А верную ў тугіх абдымках сноў
Дапальваюць нязгасныя трывогі.

Што мне да іх? Сем дзён таму назад
З уздыхам свету я «бывай» сказала,
Бо душна там, прабралася я ў сад
Пад позірк зор, расчуліць ліру дбала.

*1918*

***

*(«Течет река неспешно по долине...»)*

Цячэ рака няспешна па лагчыне,
І на пагорку шматаконны дом.
А мы жывём, нібы пры Кацярыне:
Жнівом малебны пра ўмалот вядзём.
У стоме ад двухдзённае разлукі,

Госць нівай залатой да нас імкне,
Бабульцы ён цалуе ў сенцах рукі,
Пасля, на стромкіх сходах, вусны – мне.

*1917*

***

*(«Когда в тоске самоубийства...»)*

Калі ў журбе самазабойства
Гасцей нямецкіх люд чакаў,
І візантыйства вобраз боскі
Ад рускай цэрквы адлятаў,

Калі прынеўская сталіца,
Забыўшы прывіды свае,
Як п’янаватая блудніца,
Не знала, хто бярэ яе, –

Мне голас быў. Ён зваў уцешна,
Ён мне казаў: «Хадзі сюды,
Пакінь свой край глухі і грэшны,
Пакінь Расію назаўжды.

Я кроў ад рук тваіх адмыю,
Ды з сэрца выну мрак і золь,
Я новым іменем акрыю
Параз і крыўд пакутны боль».

Ды рукі ўласныя з пагардай
Міжвольна выканалі рух,
Каб я не чула слоў нявартых,
Што могуць зганьбіць скрушны дух.

*1917*

# З КНІГІ «ANNO DOMINI» (1922)

## *Петраград, 1919*

*(Петроград, 1919)*

*У тыя неймаверныя гады...*
Цютчаў

І мы забылі назаўжды,
Зняволены ў сталіцы дзікай,
Азёры, стэпы, гарады
І зоры той зямлі вялікай.

Крывавы круг днём і ўначы
Бязлітасна сціскае стома...
Ніхто не здольны памагчы
За тое, што мы й сёння дома,

Што любім горад і ў журбе,
А не крылатую свабоду
І захавалі для сябе
Яго агні, палацы, воды.

Другая блізіцца пара,
І вецер смерці сэрца студзіць,
Ды горад наш святы Пятра
Нам помнікам міжвольным будзе.

*1920*

## *Прадказанне*

*(Предсказание)*

Я вянец бачыў з золата зладжаны...
Непатрэбны тут зайздрасці жар!
Ад таго, што вянец гэты крадзены,
І табе не ўпрыгожыць ён твар.
Моцна звітай галінай цярноваю
Заблішчыць на табе, як сіло.
І дарма, што расою барвоваю
Ён астудзіць твой спешчаны лоб.

*1922*

***

*(«Сказал, что у меня соперниц нет...»)*

Сказаў, што мне саперніц не было.
Я не жанчына для яго зямная,
А сонейка зімовага святло
І пракаветны спеў святога краю.
Калі памру, не будзе сумаваць,
Не крыкне звар'яцела: «Уваскрэсні!» –
Ды ўцяміць раптам – нельга існаваць
Без сонца целу і душы без песні.
...А зараз што?

*1921*

***

*(«Земной отрадой сердца не томи...»)*

Зямной уцехай сэрца не тамі,
Не патурай ні жонцы і ні дому.
Ва ўласнага дзіцяці хлеб вазьмі,
Каб голад наталіць чужому.

І службу ты пакорліва нясі
Ў таго, хто быў пякельным супастатам,
І назаві ляснога звера братам,
І анічога ў Бога не прасі.

*1921*

***

*(«Ты всегда таинственный и новый...»)*

Таямнічы ты заўжды – і новы,
Я ўсё паслухмяней з кожным днём.
Ды любоў твая, сябрук суровы,
Як іспыт жалезам і агнём.

Пецъ забараніў мне і ўсміхацца,
А маліцца не даеш даўно.
Толькі мне б з табою не расстацца,
Што яшчэ там будзе – ўсё адно!

Так, нябёсам і зямлі чужая,
Я жыву і болей не пяю,
Нібы ў апраметнай ты і ў ра́і
Вольную душу забраў маю.

*1917*

***

*(«Тебе покорной? Ты сошел с ума!..»)*

К табе ў няволю? Пэўна звар'яцеў?!
Я ведаю адну Гасподню волю.
Навошта мне чакаць дрыготка болю:
Муж – кат, а дом – турма. Ты так хацеў?

Ды бачыш ты! Прыйшла сама, знарок...
Быў снежань, і вятры дранцвелі ў полі.
Было так светла мне ў тваёй няволі,
А за вакном стаяў на варце змрок.

Так птушка ў сцюжную празрыстасць шкла
Ўсім целам б'ецца, сэрца рве на часткі,
Крывёю пляміць белізну крыла.

Я зведала спакой і шчасце пасткі.
Бывай, мой ціхі, дзякуй, што цяплом
Вандроўніцы адкрыў уласны дом.

*1921*

***

*(«Веет ветер лебединый...»)*

Вее вецер лебядзіны,
Неба сіняе ў крыві.
Надыходзяць гадавіны
Першых дзён тваёй любві.

Мае чары разбурыў ты,
Як вада, плылі гады.
І чаму ўсё ж не стары ты,
А такі, як быў тады?

Стаў пяшчотней голас мілы,
Толькі тых часоў крыло
Снежнай славай ацяніла
Бесклапотнае чало.

*1922*

***

*(«Заболеть бы как следует в жгучем бреду...»)*

Захварэць бы як след, у трызне́нні ляжаць
І сустрэцца б з усімі ізноў,
Поўным ветру і сонца прымор’ем гуляць
Па шырокіх алеях садоў.

І нябожчыкі згодныя сёння прыйсці,
І выгнаннікі ў доме маім.
Ты за ручку дзіця да мяне прывядзі,
Так даўно я сумую па ім.

Буду есці я з мілымі ўсмак вінаград,
Буду піць ледзяное віно
І глядзець, як струменіць сівы вадаспад
На крамнёва-вільготнае дно.

*1922*

## *Лотава жонка*

*(Лотова жена)*

*А жонка Лотава за ім азірнулася*
*і зрабілася саляным слупам.*
Кніга Быцця[1]

І праведнік рушыў за служкамі Бога
Вялізны ды светлы па чорнай гары.
Ды ў жончыным сэрцы крычала трывога:
Не позна пабачыць да гэтай пары

Чырвоныя, родныя вежы Садома
І плошчу, дзе пела, і двор, дзе расла,
І вокны пустыя высокага дома,
Дзе з мужам каханым дзяцей прывяла.

Зірнула – і болей, скаваныя болем,
На свет яе вочы глядзець не маглі;
І цела празрыстай зрабілася соллю,
І шпаркія ногі к зямлі прыраслі.

Ці плакаць па гэтай жанчыне хто будзе?
Ці мала на свеце жалобных хвілін?
Ды сэрца маё, далібог, не забудзе
Ахвяру жанчыны за позірк адзін.

*1924*

---

[1] Пераклад В. Сёмухі.

***

*(«Небывалая осень построила купол высокий...»)*

Небывалая восень узнесла нам купал высокі,
Быў аблокам загад гэты купал сабой не цямніць.
І дзівіліся людзі: дзе ж верасня пэўныя крокі
І куды пазнікалі сцюдзёна-вільготныя дні?..

Заярчэлі смарагдам каналаў змутнелыя воды,
Крапіва, быццам ружы, запахла, ды толькі мацней.
У задусе пякельнай пунсова шалелі заходы –
Захаваецца гэта і ў памяці нашых дзяцей.

Сонца ў небе жыло, бы ў сталіцы свавольны мяцежнік,
І вясновая восень так лашчылася да яго,
Што здавалася –
                    зараз прачнецца празрысты падснежнік...
Вось калі падышоў ты, спакойны, да ганку майго.

*1922*

## *Эпічныя матывы*

*(Эпические мотивы)*

*Я спяваю, і лес зелянее.*
Б. А.

**1**

Я гасцявала на зямлі ў той час.
Далі імя мне пры хрышчэнні – Анна,
Салодкае для вуснаў і для слыху.
Так дзіўна радасць зведала зямную.
Тады і свят лічыла не дванаццаць,
А столькі, колькі дзён складала год.

Пакорлівая таямнічай волі,
Абрала я сяброўкаю свабоду,
Любіла толькі сонейка і дрэвы.
Аднойчы познім летам іншаземку
Сустрэла я ў падступны час зары,
Купаліся мы ў цёплым моры разам.
Яе ж убранне дзіўным мне здалося,
А словы з вуснаў – дык яшчэ дзіўней,
Як зоркі-знічкі вераснёўскай ноччу.
І зграбная мяне вучыла плаваць,
Адной рукой падтрымлівала цела,
Няўмелае ў крутых, свавольных хвалях.
І, стоячы ў блакітнае вадзе,
Яна са мной няспешна размаўляла.

Здавалася, што вершаліны лесу
Шумелі злёгку ці рыпеў пясок,
Ці то дуда спявала срэбнагучна
Ўдалечыні пра вечары разлук.
Ды слоў яе я помніць не магла,
І з болем прачыналася ўначы я.
Мне мроіўся крыху раскрыты рот,
Вачэй святло і гладкая фрызура.
Як вестуна нябеснага, маліла
Я дзеўчыну журботную тады:
«Скажы, скажы, навошта згасла памяць
І, так нясцерпна песцячы мой слых,
Ты адняла раскошу паўтарэння?.. »
І толькі раз, калі я вінаград
Збірала неяк у лазовы кошык,
Смуглявая ж сядзела на траве
Праставалосая, стуліўшы вейкі,
І стомленай была, і трохі млявай
Ад водару саспелых сініх ягад
І вострага дыхання дзікай мяты, –
Яна дзівосныя прыўнесла словы
Ў скарбонку ўдзячнай памяці маёй
І, выпусціўшы поўны кошык з рук,
Да сухавейнай я зямлі прыпала,
Як да каханка, пад мілосці спеў.

*1913*

2

Пакінуўшы гаі святой радзімы
І дом, дзе Муза, плачучы, мадзела,
Я, ціхая, вясёлая, жыла
На нізкай выспе, што, нібыта плыт,
Спынілася ў шыкоўнай неўскай дэльце.
О, таямніцы тых зімовых дзён,
І стома лёгкая ад любай працы,
І ружы на ўмывальніку ў збанку!
Быў той завулак снежным і нядоўгім.
Стаяў насупраць нас алтарным мурам
Узнёслы храм Святое Кацярыны.
На золку выбіралася я з дому,
І часцяком па снежным цаліку
Свае сляды ўчарашнія дарэмна
Шукаючы на посцілцы бялюткай
Уздоўж ракі, дзе на прыколе шхуны,
Як галубкі, туліліся пяшчотна
І да вясны па ўзмор'і сумавалі, –
Я да маста выходіла старога.
Там быў пакой у брудным шумным доме
Пад самым дахам, рыхтык тая клетка,
Дзе ён, як чыж, свісцеў перад мальбертам,
Ды скардзіўся мне весела, і сумна
Пра радасць, што не сталася, казаў.

Глядзела я трывожна, бы ў люстэрка,
На палатно, дзе з кожным новым тыднем
Было на дзіва горшым падабенства
Маё з маім вобразатворам новым.

Цяпер не знаю, дзе мастак мой мілы,
З якім я з той блакітнае мансарды
Выходзіла на дахі праз акенца
Ды йшла па гзымсе над смяротнай прорвай,
Каб бачыць снег, аблокі і Няву, –
Ды адчуваю – дружныя ў нас Музы

Сяброўствам бесклапотным і прывабным
Дзяўчат, што не адведалі любві.

*1915*

3

Сутоніцца, і ў небе цёмна-сінім,
Дзе так нядаўна храм Ерусалімскі
Ярчэў узнёслым цудам таямнічым,
Адно – дзве зоркі над спляценнем веццяў,
І снег ляціць аднекуль, ды не зверху,
А быццам ён узносіцца з зямлі,
Лянотны ды пяшчотна-асцярожны.
Здалося дзіўным мне ў той дзень гулянне.

Калі я выйшла, асляпіў мяне
Празрысты блік на рэчах і на тварах,
Нібы паўсюль паслаліся пялёсткі
Тых небуйных жоўта-ружовых руж,
Якіх назоў я ўжо даўно забыла.
Сухое і без ветрыку паветра
Так беражна люляла кожны гук –
Здавалася, маўчання не бывае.
На мосце ж тым, праз поручняў іржу
Прасоўваючы рукі ў рукавічках,
Кармілі дзеці гурт стракатых качак,
Што плёскаліся ў цемрыве палонкі.
І я падумала: не можа быць,
Каб я хоць некалі забыла гэта.
І калі цяжкі шлях мяне заве,
Вось лёгкі груз, што несці мне пад сілу,
Каб некалі і ў хворасці старэчай,
А можа, і ў галечы ўспамінаць
Чароўны захад той, і паўнату
Душэўных сілаў, і жыцця прывабнасць.

*1914–1916, 1940*

***

*(«Всё расхищено, предано, продано...»)*

*Наталіі Рыкавай*

Тут і здраджана ўсё, й распрададзена,
Чорнай смерці мільгала крыло,
Ўсё з галоднай тугою раскрадзена,
Дык адкуль жа паўстала святло?

Днём дыханнямі вее вішнёвымі
Па-за горадам лес, быццам лёс,
Ноччу ззяе сузор'ямі новымі
Ласка ліпеньскіх чыстых нябёс, –

Падыходзіць так блізка цудоўнае
К тым разбураным, брудным дамáм...
Анікому да нас невядомае,
Ды спрадвеку жаданае нам.

*1921*

***

*(«Сослужу тебе верную службу...»)*

Саслужу табе верную службу, –
Ты не бойся, што горка люблю!
Я за нашу вясёлую дружбу
Ўсіх свяціцеляў сёння малю.
За цябе аддала першародства
І нічога ўзамен не прашу,
Вось таму рызманы ад сіроцтва,
Быццам шлюбныя рызы, нашу.

*1921*

***

*(«Кое-как удалось разлучиться...»)*

Удалося сяк-так разлучыцца,
Апастылы агонь патушыць.
Вораг вечны, пара навучыцца
Вам кагосьці напраўду любіць.

Я дык вольная. Мне ўсё забава –
Ноччу Муза зляціць суцяшаць,
А наранку прыцягнецца слава
Мне бразготкай над вухам трашчаць.

За мяне і маліцца не варта,
І глядзець з паўдарогі назад ...
Чорны вецер суцішыць, а жарты
Прынясе залаты лістапад.

Падарункам прыму я расстанне,
Забыццё ласкай буду ўспрымаць.
Ды, скажы мне, на раскрыжаванне
Здольны будзеш другую паслаць?

*1921*

***

*(«Я гибель накликала милым...»)*

Я гібель наклікала мілым,
І гінуць адзін за адным.
О, гора мне! Тыя магілы
Прадказаны словам маім.
І як груганы кружаць, чуюць
Гарачую свежую кроў,
Так дзікія песні пяю я –
Маю насылаю любоў.

З табой мне салодка, спякотна,
Ты блізкі, як сэрца – мальбе.
Дай рукі мне, слухай спакойна.
Сыдзі, – заклінаю цябе.
І хай не дазнаюся, дзе ты.
О, Муза, яго не заві,
Хай будзе жывым, неапетым –
Маёй не спазнае любві.

*1921*

## ***Прывід***

*(Призрак)*

Ярчэюць рана ліхтары
Яшчэ да надыходу ночы,
На іх рыпучыя шары
Сняжынкі падаюць святочна.

І, паскараючы свой бег,
Нібы ў прадбачанні пагоні,
Праз мяккі і павольны снег
Імчаць пад сіняй сеткай коні.

І раззалочаны гайдук
Не варухнецца за санямі,
І дзіўна цар глядзіць наўкруг
Пустымі светлымі вачамі.

*1919*

# З ЦЫКЛА «ТРЫСНЁГ» (ЗБОРНІК «З ШАСЦІ КНІГ», 1940)

## *Муза*

*(Муза)*

Калі чакаю ў ноч яе прыходу,
Жыццё маё вісіць на валаску.
Штó маладосць, штó гонар, штó свабода? –
Мне б толькі ўбачыць з дудачкай руку.

Вось госця тут. Скідае пакрывала,
Глядзіць выпрабавальна на мяне.
Пытаюся:
                – Ты Дантэ дыктавала
Старонкі «Пекла»?
                – Я! – ківае мне.

*1924*

## ***Мастаку***

*(Художніку)*

Мне мроіцца ўсё плён тваёй работы,
Дабраслаўлёныя тваёй рукой тады:
Ліп, назаўжды асенніх, пазалота,
Сінеча сёння створанай вады.

Падумай, і танчэйшая дрымота
Ізноў вядзе мяне ў твае сады,
Дзе кожнага баюся паварота,
Шукаючы ў бяспамяцтве сляды.

Ці траплю пад чароўныя скляпенні,
Што мастака рука на неба зменіць,
Каб астудзіўся мой абрыдлы жар?..

Там стану я шчасліваю навекі
І, полымныя змружыўшы павекі,
Я зноўку атрымаю слёзны дар.

*1924*

***

*(«Если плещется лунная жуть...»)*

Месяц здольны жудой агарнуць,
Горад млее ў атрутным растворы.
Без ніякай надзеі заснуць
Бачу я праз зялёную муць
Не маленства маё і не мора,
І не тых матылёў шлюбны лёт
Надградой беласнежных нарцысаў
У якісьці шаснаццаты год...
А застылы навек карагод
Надмагільных тваіх кіпарысаў.

*1928*

***

*(«Одни глядятся в ласковые взоры...»)*

*Памяці М. У. Н.*

Адны глядзяцца ў позірк пачуццёвы,
Другія п'юць, і ранак свеціць ім,
А я ўсю ночку ладжу перамовы
З сумленнем неўтаймованым маім.

Я гавару: «Ярмо тваё нясу я
Мне муляе яно каторы год».
Ды для яго і часу не існуе,
Няма й прасторы ў свеце для яго.

І зноўку чорны масленічны вечар,
Злавесны парк, няспешны бег каня.
І поўны шчасця й весялосці вецер,
Са стром нябёс мне дорыць вышыня.

А нада мной спакойны і двухрогі
Лунае сведка... О, туды, туды,
Па даўняй Падкапрызавай дарозе,
Дзе лебедзі ля мёртвае вады.

*1935*

## *Барыс Пастарнак*
*(Поэт <Борис Пастернак>)*

Сам параўнаў сябе ён з конскім вокам,
Глядзіць наўкоса, бачыць, пазнае,
І вось ужо алмаз цячэ патокам,
У ззянні луж, лёд стому зазнае.

Імглой ліловай дыхаюць задворкі,
Платформы, дровы, лісця талака.
Свіст цягніка, пах кавуновы горкі,
І ў лайцы пахкай пудкая рука.

Звініць, грыміць, скрыгоча, б'е прыбоем
І раптам сціхне, – гэта значыць, ён
Нясмела прабіраецца па хвоях,
Каб не спужаць прасторы чуйны сон.

І гэта значыць, лічыць ён зярняты
Ў пустым калоссі, гэта значыць, зноў
Да той пліты дар'яльскае праклятай,
З хаўтураў невядомых ён прыйшоў.

Маскоўская пячэ штораз утома,
Смяротна бомы пачалі звінець...
Хто ж за два крокі заблукаў ад дома,
Дзе снег па пояс і ўсяму канец?

Ён дым быў параўнаў з Лаакаонам,
Цвінтарны апяваў чартапалох.
За тое, што напоўніў новым звонам
Свой новы свет адлюстраваных строф, –

Дзяцінствам дзіўным быў навек адзначан,
Зор шчодрасцю і зоркасцю свяціл,
І ўся зямля – адна з ягоных спадчын,
А ён яе нам з вамі прысвяціў.

*1936*

## ***Падвал памяці***

*(Подвал памяти)*

*О, пограб памяці.*
Хлебнікаў

Што ў смутку я жыву – ў тым шмат лухты –
І што таму мяне ўспаміны точаць.
Я ў памяці ў гасцях гады ў рады,
Ды і яна заўжды мяне марочыць.
Як з ліхтаром спускаюся ў падвал,
Мне падаецца – зноў глухі абвал
За мной па вузкай лесвіцы грукоча.
Чадзіць ліхтар, вярнуцца не магу,
А ведаю – да ворага іду.
І я прашу, як міласці... Ды там
Цямрэча. Змоўклі гукі паланэза!
Аж трыццаць год, як выправілі дам,
Ад старасці сканаў і той гарэза...
Спазнілася. Ну, гэткае бяды!
Мне нельга паказацца нікуды́.
Ды я кранаю фрэскі цёмных сцен,
Камінам грэюся, і раптам – ах ты!
Скрозь гэту плесню, гэты чад і тлен
Тут бліснулі жывыя два смарагды.
І мяўкнуў кот. Усё, хадзем дамоў!
Ды дзе цяпер мой дом, дзе думкі схоў?

*1940*

# З паэмы «Рэквіем» (1935–1962, цалкам апубл. у 1987)

## *Уступ*

*(«Это было, когда улыбался...»)*

Быў той час, калі шчыра ўсміхаўся
Толькі мёртвы, спакойнасці рад.
І няважнай даважкай туляўся
Каля турмаў сваіх Ленінград.
Як ішлі, звар'яцеўшы ад мукі,
Тых засуджаных ладам палкі,
І кароткую песню разлукі
Паравозныя вылі гудкі,
Зоры смерці стаялі над часам,
І канала бязвінная Русь
Пад крывавым чырвоным абцасам
І пад шынамі чорных марусь.

*1940*

## *I. ****

*(«Уводили тебя на рассвете...»)*

Забіралі цябе на дасвецці,
За табой, як на вынасе, йшла,
У паўзмроку заплакалі дзеці,
Свечка ля абразоў аплыла.
На губах тваіх холад іконкі.
Смертны пот на чале... не забыць!
Буду я, як стралецкія жонкі,
Пад крамлёўскімі вежамі выць.

*Восень 1935, Масква*

## *IV. ****
## *(«Показать бы тебе, насмешнице...»)*

Паказаць бы табе, насмешніцы
І ўлюбёніцы ўсіх суздром,
Царскасельскай вясёлай грэшніцы,
Што далей з тваім будзе жыццём –
Як стаяць ля «Крестов» з перадачаю,
Дзе наперадзе больш трохсот,
І сваёю слязою гарачаю
Лёд прапальваць пад Новы год.
Ля турмы таполя гайдаецца,
І ні гуку – а колькі там
Бесправінных жыццяў канчаецца...

*1938*

## *VII. Прысуд*
*(Приговор)*

Цяжкае, нібы з камення, слова
Грудзі мне прыціснула тады.
Ды нічога, я была гатова.
Спраўлюся і з гэтым, не бяды.

Сёння я шмат клопату займела:
Трэба памяць да канца забіць,
Трэба, каб душа закамянела,
Трэба зноўку навучыцца жыць.

Бо інакш... Спякотны шолах лета,
Быццам свята за маім акном...
Я даўно прадбачыла ўсё гэта –
Светлы дзень і апусцелы дом.

*22 чэрвеня 1939*
*Фантанны Дом*

## *IX. ****

## *(«Уже безумие крылом...»)*

Ужо вар’яцтва, як крылом,
Душы накрыла палавіну,
І поіць вогненым вінам
І кліча ў чорную лагчыну.

Я зразумела, што яго
Здабыткам будзе перамога,
Бо да трызнення да свайго
Ўжо стаўлюся як да чужога.

І анічога мне з майго
Яно не дасць забраць з сабою
(Ну, як ні ўпрошвай ты яго
І як не назаляй мальбою):

Ні боль у сынавых вачах –
Акамянелыя пакуты –
Ні першай навальніцы жах,
Ні стрэч да вязніцы прыкутых,

Ні прахалоду мілых рук,
Ні ліп збянтэжаныя цені,
Ні адляцелы лёгкі гук
Апошніх слоў і суцяшэнняў.

*1940*

# СА ЗБОРНІКАЎ «БЕГ ЧАСУ» І «СЁМАЯ КНІГА»

## Цыкл «Таямніцы рамяства»

### *1. Творчасць*

*(Творчество)*

Бывае так: у сэрцы ные стома;
Нязмоўчны бой гадзінніка ў вушах;
За даляглядам ціхі рокат грому.
У прывідных палонных галасах
Здаецца, чую процьму скаргаў, стогнаў,
Сціскаецца таемны нейкі круг,
Ды ў бездані чароўных шэптаў, звонаў
Перамагае ўсё адзіны гук.
А ўкруг яго так непаўторна ціха –
Што чутна, як расце трава ў гаях,
Як па зямлі вандруе з торбай Ліха...
А вось ужо і словы – у працяг
І лёгкіх рыфмаў дзіўныя званочкі, –
Тады я разумею, што са мной,
І мне прадыктаваныя радочкі
Кладуцца ў беласнежны сшытак мой.

*1936*

## *2. ****

*(«Мне ни к чему одические рати...»)*

Нашто мне одаў звонкая пустэча,
Элегій вынаходлівых ялей?
Павінна ў вершы ўсё быць недарэчы,
Не так, як у людзей.

Калі б вы ведалі з якога смецця
Расце мой верш – і сорам не бяда –
Як дзьмухавец ля плота песціць квецень,
Як лопухі ды лебяда.

Сярдзіты вокрык, водар дзёгцю свежы,
Таемнасць плесні на старой сцяне...
І верш гучыць пяшчотны, незалежны,
На радасць вам і на пакуты мне.

*1940*

## *3. Муза*

*(Муза)*

Як даць рады мне гэтаму грузу,
А яшчэ называюць Музай,
Кажуць мне: «На лузе ты з ёй...»
Кажуць мне: «Вер Гасподняй ласцы...»
Адтрасе горай горкай трасцы,
Потым зноўку год ні нагой.

*1960*

## *4. Паэт*

*(Поэт)*

Падумаеш, гэткая праца, –
Бяздумнае гэта жыццё:
Да музыкі жартам дабрацца,
Падслухаць і ўзяць за сваё.

Чыёсьці вясёлае скерца
Ва ўласныя ўклаўшы радкі,
Паклясца, што беднае сэрца
Заходзіцца стогнам такім.

А потым падслухаць у лесу,
У соснаў, маўклівых на від,
Пакуль дымавая завеса
Туману хавае блакіт.

Налева й направа бяру я,
І нават не чую віны,
Няшмат у жыцця, што віруе,
І ўсё – у начной цішыні.

*1959*

## *5. Чытач*

*(Читатель)*

Не можа быць надта няшчасным,
Хаваць ад цікаўных свой свет! –
Каб быць і сучасніку ясным,
Наросхрыст раскрыты паэт.

І рампа ў яго пад нагамі
Змярцвелае цэдзіць святло.
Лайм-лайт, быццам сувязь з багамі,
Паставіць таўро на чало.

А кожны чытач – гэта тайна,
Што скарб закапаны даўно,
Хай самы апошні, звычайны,
І слоў ад яго не чутно.

Усё, што прырода схавае,
Калі ёй патрэбна, ад нас.
Там нехта гаротна рыдае
Ў якісьці прызначаны час.

І змрочна сутонеюць ночы,
І ценем халодзіць імгла.
Там тыя нязнаныя вочы
Гамоняць са мной да святла,

За нешта мяне папракаюць,
І згодныя ў нечым са мной...
Так споведзь ільецца нямая,
Размовы з чысцюткай душой.

Наш век на зямлі хуткацечны
І цесны прызначаны круг,
А ён жа нязменны і вечны –
Паэта няведамы друг.

*1959*

## *6. Апошні верш*

*(Последнее стихотворение)*

Адзін, быццам кімсьці ўстрывожаны гром,
Як подых жыцця, урываецца ў дом,
Ля горла казыча, смяецца,
Вальсуе, б'е ў ладкі, здаецца.

Другі, што народзін начных не міне,
Крадзецца апоўначы знекуль ка мне,
Цікуе з люстэрка пустога,
І нешта мармыча сурова.

А ёсць і такі, што жыве як у сне,
Апоўдні амаль што не бачыць мяне,
Па белай паперы бруіцца,
Нібыта ў лагчыне крыніца.

А вось і таемны, што ходзіць наўкруг –
Не гук і не колер, не колер, не гук –
Рабрыцца і зменліва ўецца,
А ў рукі жывым не даецца.

А гэты!.. па кропельцы высмакча кроў,
Як злая дзяўчына ў юнацтве – любоў,
І мне не сказаўшы ні слоўка,
Бязмоўем прыкінецца зноўку.

Ніколі не ведала горшай бяды.
Сышоў, але цягнуцца болем сляды
К нязнанаму скрайняму краю,
А я без яго... паміраю.

*1959*

## *7. Эпіграма*
*(Эпиграмма)*

Як Дантэ, Бічэ ці магла б тварыць,
Ці Лаўра – пра мілосці жар не схлусіць?
Жанчын я навучыла гаварыць...
Ды, Божа, як – замоўкнуць іх прымусіць!

*1958*

## *8. Пра вершы Нарбута*

*(Про стихи Нарбута)*

Гэта – вытрымкі бяссонніц,
Гэта – слёзы свечак тых,
Гэта – сотняў белых звонніц
На дасвецці першы ўздых...
Гэта – цёплы падваконнік
На чарнігаўскі капыл,
Гэта – пчолы, гэта – доннік,
Гэта – змрок, спякота, пыл.

*1940*

## *9. ****

*(«Многое еще, наверно, хочет...»)*

Многае яшчэ, напэўна, хоча
Быць апетым голасам маім:
Тое, што ў душы без слоў грукоча,
Камень, што і ў цемры бачаць вочы,
Ці святло, што бліскае праз дым.
А ў мяне разлік складаны самы
З полымем і ветрам, і вадой...
Вось таму мае дрымоты-драмы
Разнасцежваюць да зорак брамы
І вядуць за ранішняй зарой.

*1942*

***

*(«А в книгах я последнюю страницу...»)*

А ў кнігах я апошнюю старонку
Заўжды любіла больш за ўсіх другіх, –
Калі ўжо нецікавыя нізвання
Герой і гераіня, і прайшло
Так шмат гадоў, што не шкада нікога,
І нам ужо здаецца, што сам аўтар
Пачатак той аповесці забыў,
І нават «вечнасць пасівела»,
Як сказана ў адной прыўкраснай кнізе.
Але ўсё зараз, зараз
Закончыцца, і аўтар зноўку будзе
Самотны да канца, суздром, а ён
Стараецца яшчэ дасціпным звацца
Ці проста кпіць – прабач яму, Гасподзь! –
Прыладжваючы пышную канцоўку,
Напрыклад гэткую:
...І толькі ў двух дамах
У нейкім горадзе (з назовам цьмяным)
Застаўся профіль (абмаляваны кімсьці
На вапне беласнежнае сцяны),
Таемны – не жаночы, не мужчынскі.

І, кажуць, калі месяца святло –
Зялёнага, сярэднеазіяцкага –
Апоўначы па сценках прабягае,
І асабліва ў навагодні вечар,
Дык чуецца якісьці лёгкі гук,
Пры гэтым нехта лічыць яго плачам,
Другія разбіраюць словы ў ім.
Ды гэты цуд усім паднадакучыў,
Гасцей няшмат, тутэйшыя прывыклі,
І кажуць, што ў адным з такіх дамоў
Закрыты дыванам праклятая профіль.

*1943*

## З цыкла «У саракавым годзе»

**5. *****

*(«Но я предупреждаю вас...»)*

Я папярэджваю ўсіх вас,
Што я жыву апошні раз.
Ні ластаўкай, ні клёнам,
Ні трыснягом, ні знічкай,
Ні ручаём крынічным,
Ні мілагучным звонам –
Людзей не буду хваляваць
І ў сны чужыя залятаць
Ненаталёным стогнам.

*1940*

## З нізкі «Месяц у зеніце»

### *7. З’яўленне месяца*

*(Явление луны)*

*А. К<азлоўскаму>*

Як з перламутру і агату,
А ці з задымленага шкла,
Так нечакана і паката,
Як урачыстасць, усплыла, –
Бы «Месяцовая саната»
Нам шлях перасячы змагла.

*1944*

## З нізкі «Смерць»

### *III. ****

*(«И комната, в которой я болею...»)*

І той пакой, дзе я цяпер хварэю,
Апошні раз хварэю на зямлі,
Як быццам упіраецца ў алею,
Дзе стромкія таполі параслі.
А гэты першы – гэты самы слаўны,
У велічы сваёй самадзяржаўны,
Ды ўсцешана запляскае і ён,
Калі, мінуўшы цьмянае аконца,
Мая душа ўзляціць насустрач сонцу,
І знішчыць той смяротны сон.

*1943*

## *[Interieur]*
*(«Когда лежит луна ломтем чарджуйской дыни...»)*

Калі тут маладзік скрылём чарджуйскай дыні
На падваконні спіць, задуха за акном,
Калі закрыты дзверы, й зачараваны дом
Блакітнай гронкай прывідных гліцыній,
І ў кубку з гліны прахалодная вада,
І белы ручніка сумёт, і свечка з воску, –
Як для абраду ўсё. Адно, што адгалоскам
Грукоча цішыня, маіх не чуе слоў,
Тады з чарнюткай цьмы рэмбрантаўскіх куткоў
Склубіцца й знікне раптам дзіўная праява,
Ды не спужаюся, не схамянуся нават...
Тут адзінота зноў мяне злавіла ў нерат.
Як праз вякі тутэйшы кот глядзіць з няверай,
І хоць двайнік у люстры не адводзіць воч
Салодка й ціха буду спаць. Дабранач, ноч!

*1944*

## З «Нізкі чатырохрадкоўяў»

***

*(«В каждом древе распятый Господь...»)*

Што ні дрэва – распяты Гасподзь,
Што ні колас, то Цела Хрыстова,
І малітвы ўсячыстае слова
Гоіць нам хваравітую плоць.

*1946*

## ***Да вершаў***

*(К стихам)*

Вялі па сцежках за сабою,
Нібыта ў цемру знічкі знак,
Былі вы горыччу, манoccurrence,
А суцяшэннем – аніяк.

*1961*

## ***Канец Дэмана***

*(Конец Демона)*

Як Урубель наш неверагодны,
Профіль промень начны маляваў.
І паведаў нам вецер лагодны
Ўсё, што Лермантаў прыхаваў.

*1961*

***

*(«И было сердцу ничего не надо...»)*

Было на сэрцы адчуванне ладу,
Калі піла я жар пякучы той...
Узнёслая «Анегіна» грамада,
Як воблака лунала нада мной.

*1962*

***

*(«О своем я уже не заплачу...»)*

Па сваім ужо я не заплачу,
Хай зямлю маю не апячэ
Залатога таўра знак няўдачы
На чале, ціхамірным яшчэ.

*1962*

***

*(«Взоры огненней огня...»)*

Позірк за агонь мацней,
Як у Леля ўсмешка...
Красавік, не хлусь ты мне
Ў дзень свой самы першы!

*1963*

***

*(«...И на этом сквозняке...»)*

...І на гэтым скразняку
Пазнікалі думкі нават...
Вечнага мастацтва справа –
Ўлегцы ўжо на тым вяку!

*1943*

***

*(«И скупо оно, и богато...»)*

Ашчадна яно і багата,
Так, сэрцу багацця стае!
Чаго ж ты маўчыш вінавата?
Не бачылі б вочы мае!

*1910-я*

***

*(«И слава лебедью плыла...»)*

Хвала лябёдкаю плыла
Праз залацісты дым.
А ты, любоў, заўжды была
Сном роспачным маім.

*1958*

## *Пад Каломнай*

*(Под Коломной)*

*Шарвінскім*

...Дзе на чатырох высокіх лапах
Той званіцы звонкія бакі
Стромяцца, дзе ў полі водар мяты,
І ў капелюшах чырвоных макі
Ходзяць да маскоўскае ракі, –
Тут з бярвення ўсё і з дошак гнута...
Поўным коштам цэдзіцца мінута
Ад гадзін пясочных. Гэты сад
За лясы і пушчы больш дрымучы,
І над ім, як над прадоннай кручай,
Сонейка з-за хмары неўміруча
Пільны і пяшчотны лье пагляд.

*1943*

## З нізкі «Cinque»[1]

### *4. ****

*(Знаешь сам, что не стану славить...)*

Знаеш сам, што не буду славіць
Той сустрэчы гарчэйшы дзень.
Што пакінуць табе на памяць,
Можа, цень мой? Нашто табе цень?
Прысвячэнне спаленай драмы,
Ад якой знік і попелу след,
Ці вось той, што пакінуў раму,
Навагодні страшны партрэт?
Ці ледзь чутны пасля мяцеліц
Звон бярозавых вугалёў,
Ці ўсё тое, што мне не паспелі
Дасказаць пра чужую любоў?

*1946*

[1] Пяць (*іт.*)

## Са спаленага сшытка
## («ШЫПШЫНА ЦВІЦЕ»)

### *6. Сон*

*(Сон)*

*Салодка бачыць незямныя сны?*
Аляксандр Блок

Прарочы быў той сон ці непрарочы...
Марс святкаваў у небе ўласны фэст,
Ён пунсавеў, злавесным быў той ноччу,
А я тады сасніла твой прыезд, –

Ён быў ва ўсім... І ў бахаўскай Чаконе,
І ў ружах, што дарэмна расцвілі,
І ў сельскіх цэркваў кволым переразвоне
Над узаранай чарнатой зямлі,

І ў восені, што падышла ўшчыльную,
Ды раптам пачала сябе хаваць.
О, жнівень мой, як мог ты вестку тую
Мне ў гадавіну страшную аддаць!

Чым падарунак царскі аплачу я?
Куды ісці, з кім святкаваць найперш?
І без памарак, як раней, пішу я
У спалены свой сшытак новы верш.

*1956*

## *8. ****

*(«Ты выдумал меня. Такой на свете нет...»)*

Ты выдумаў мяне. Такой не знае свет,
На свеце не знайсці такую.
Ні доктар не спатоліць, ні паэт, –
Цень прывіду цябе і дзень, і ноч турбуе.
А мы спаткаліся ў неверагодны год,
Калі ўжо цалкам зніклі свету сілы,
Было ў жалобе ўсё, блажэла ад нягод,
І свежымі былі адно магілы.
Без ліхтароў, як смоль, быў чорны неўскі вал,
Глуханямая ноч наўкол сцяной стаяла...
Дык вось калі цябе мой голас выклікаў!
Рабіла што – сама яшчэ не ўсведамляла.
Ты шляхам яснай зоркі апынуўся тут,
Калі трагічна восень заірдзела,
Дзе той навек спусцелы родны кут,
Адкуль чародка вершаў спаленых зляцела.

*1956*

## *Не дасылаючы паэму*

*(При непосылке поэмы)*

Прыморскія парывы ветру,
І дом, дзе мы ўжо не жывём.
Цень запаветнейшага кедра
Прад забароненым акном...

Ды нехта ёсць, каму спакусна
Магла ўсё гэта я адкрыць!

Хай усміхнуцца горка вусны,
А сэрца зноўку затрымціць.

*1963*

## З «Паўночных вершаў»

### *1. Прадвесняя элегія*

*(Предвесенняя элегия)*

*...toi qui m'as consolée.*
Gerard de Nerval[1]

Між соснаў завея сцішэла,
Ды, п'яная і без віна,
Там, быццам Афелія, пела
Ўсю ноч нам сама цішыня.
А той, хто мне толькі здаваўся,
Заручаны быў з цішынёй,
Пайшоўшы, ён шчодра застаўся,
Насмерць ён застаўся са мной.

*1963*

[1] ...*ты, хто суцешыў мяне*. Жэрар дэ Нэрваль (*фр*.)

## Са сшытка «Лішка»

### ***Прыморскі санет***

*(Приморский сонет)*

Усё мяне перажыве:
Шпакоўні ў занядбанні грэшным
І водар, што вясной няспешна
Заморскім ветрыкам плыве.

І голас вечнасці заве
З чужой няўмольнасцю няўцешнай,
І над квітнеючай чарэшняй
Бязважкі месяц у сяйве.

Нібыта лёгкі шлях у спраты,
Працяўў смарагдавыя шаты
Гасцінец – не скажу куды...

Там спаміж дрэў святло бялее,
Як царскасельская алея
Да стылай роўнядзі вады.

*1958*

## З нізкі «Вянок мёртвым»

### *I. Настаўнік*

*(Учитель)*

*Памяцi Інакенція Аненскага*

А той, каго настаўнікам лічу я,
Як цень прайшоў і ценю не пакінуў,
Атрутны морак усмактаў і выпіў,
Чакаў ён славы, ды не дачакаўся,
Хто быў прадвесцем, знакам прадказальным
Таго, што з намі потым адбылося,
Спагадліва ўдыхнуў у нас тамленне –
І задыхнуўся...

*1945*

## ***IV. Памяцi Барыса Пiльняка***

*(Памяти Бориса Пильняка)*

Ты гэта разгадаеш сам, адзiн...
Калi бяссонны мрак вакол клякоча,
Той сонечны, той ландышавы клiн
Iрвецца ў цемру снежаньскае ночы.
I я па сцежцы да цябе iду,
I ты смяешся бесклапотным смехам,
Ды хвойны лес i чараты ў стаўку
Адказваюць нам нейкiм дзiўным рэхам...
О, калi гэтым мёртвага буджу,
Ты мне прабач, я не магу iначай:
Я па табе, як па сваiм, тужу,
Зайдрошчу моцна кожнаму, хто плача,
Хто плакаць можа ў гэты страшны век
Па тых, хто там ляжыць на дне канавы...
Ды выкiпела вiльгаць да павек,
I вочы бачаць рысы нашай явы.

*1938*

## *VI. Позні адказ*

*(Позний ответ)*

*Беларучанька мая, чарнакніжніца...*
М. Ц.

Невідзімка, двайнік, перасмешнік,
Што хаваешся ў чорных кустах,
То ў шпакоўню худую заб'ешся,
То мільгаеш на згіблых крыжах,
То гукаеш з Марынчынай вежы:
«Я вярнулася сёння дамоў.
Палюбуйцеся, родныя межы,
Што за гэта зрабілі са мной.
Паглынула бяздонне любімых,
І разбураны бацькаўскі дом».
....................................
А мы сёння з табою, Марына,
Па сталіцы паўночнай ідзём,
А за намі такіх жа мільёны,
І маўклівей не знойдзеш хады,
А наўкол пахавальныя звоны
Ды маскоўскія дзікія стогны
Завірухі, што нішчыць сляды.

*1940, 1961*

## *VII. Барысу Пастарнаку*

*(Борису Пастернаку)*

*2. ****

*(«Умолк вчера неповторимый голос...»)*

*Як птушка, мне адкажа рэха.*
Б. П.

Замоўк учора непаўторны голас,
Пясняр гаёў, як птушка, адляцеў.
Ператварыўся ў жыццядайны колас,
А ці ў танюткі дождж, што ён апеў.
І кветкі ўсе, што толькі ёсць на свеце,
Насустрач гэтай смерці расцвілі.
Ды раптам стала ціха на планеце,
Што мае сціплае імя... Зямлі.

*1960*

## *XI. ****

*(«И сердце то уже не отзовётся...»)*

*М. П.*

І сэрца тое ўжо не адгукнецца
На голас мой – у шчасці ці ў журбе,
Ўсё скончана... Мой спеў ужо нясецца
Ў пустую ноч, дзе больш няма цябе.

*1953*

***

*(«Если б все, кто помощи душевной...»)*

Каб усе, хто дапамогі духу
У мяне прасіў на гэтым свеце, –
Блазнаватыя, глуханямыя,
Кінутыя жонкі ды калекі,
Катаржнікі ды самазабойцы, –
Па адной капейцы мне даслалі,
Стала б «багацей за ўсіх ў Егіпце»,
Як казаў заўжды Кузмін, нябожчык...
Ды не дасылалі мне капеек,
А дзяліліся са мною сілай,
Я цяпер дужэй за ўсіх на свеце,
Так што нават *гэта* мне не цяжка.

*1961*

## З цыкла «Паўночныя элегіі»

### *<Другая.> Пра дзясятыя гады*
*(<Вторая.> О десятых годах)*

Ніякага ружовага дзяцінства...
Вяснушачак, вядзмедзікаў і цацак,
І добрых цётак, страшных дзядзькаў, нават
Сяброў паміж каменьчыкаў рачных.
Сабе самой я з самага пачатку
Чыімсьці сном здавалася ці крозай,
А мо адбіткам люстраным, чужым,
Без імені, без плоці, без прычыны.
Ужо я знала спіс маіх злачынстваў,
Якія здзейсніць я павінна тут.
І вось, ступаючы, нібы лунацік,
Прыйшла ў жыццё, спалохаўшы яго:
Яно перада мной, як луг, ляжала,
Дзе некалі гуляла Празерпіна.
І прада мной, бязроднай і няўмелай,
Раптоўна разнасцежыліся дзверы.
Выходзілі з іх людзі – і крычалі:
«Яна прыйшла, яна прыйшла сама!»
А я на іх глядзела са здзіўленнем
І думала: «Напэўна звар'яцелі!»

І чым мацней яны мяне хвалілі,
Чым мною захапляліся мацней,
Тым мне страшней было на свеце жыць
І тым мацней хацелася прачнуцца.
І ведала, што заплачу стокроць я
Ў турме, ў труне, ў вар'яцкім доме, –
Паўсюль, дзе прачынацца трэба нам
Такім, – ды мука доўжылася шчасцем.

*1955*

## *<Чацвёртая.>* ***
## *(«Так вот он – тот осенний пеизаж...»)*

Дык вось ён – той асенні краявід,
Баялася я ўсё жыццё якога:
І неба – як палаючая бездань,
І гукі горада – нібы з нябыту
Пачутыя, чужынскія навекі.
Нібыта ўсё, з чым я ўнутры сябе
Змагалася ўвесь час, зноў расквітнела
Асобна і ўвасобілася ў тыя
Сляпыя сцены, гэты чорны сад...
А ў хвілю тую за маім плячом
Мой дом былы яшчэ сачыў за мною
Прыжмураным і непрыхільным вокам,
Тым, назаўжды мне памятным акном.
Пятнаццаць год – пятнаццацю вякамі
Гранітнымі прыкінуліся быццам,
Ды і сама была я што граніт:
Цяпер малі, пакутуй, называй
Царэўнай мора. Ўсё адно. Не трэба...
Ды трэба мне было сябе запэўніць,
Што гэта ўсё здаралася шматкроць,
І не са мной адной – з людзьмі таксама, –
І нават горай. Не, не горай – лепей.

І голас мой – было ўсё гэта, пэўна,
Страшней за ўсё – з цямрэчы прагучаў:
«Пятнаццаць год назад якім жа спевам
Сустрэла гэты дзень, нябёсы ты,
Хары сузор'яў, вод хары маліла
Ўрачыста прывітаць сваё спатканне
З тым, ад якога сёння ты пайшла...
Сярэбранае вось тваё вяселле:
Гасцей склікай, красуйся і святкуй!»

*1942*

## *<Шостая.> ****

## *(«Есть три эпохи у воспоминаний...»)*

Ёсць тры эпохі ў нашых успамінаў.
І першая – нібы мінулы дзень.
Душа пад іх скляпеннем дабрадайным,
І цела раскашуе ў іхнім цені.
Смех не аціх яшчэ, струменяць слёзы,
Чарніла след не сцёрты са стала –
На сэрцы, як пячатка, пацалунак –
Адзіны, развітальны, незабыўны...
Ды гэта дзіва цягнецца нядоўга...
Нам не скляпенні бачацца, а нейкі
Дом адасоблены ў глухім прадмесці,
Дзе ўзімку холадна, а ўлетку спёка,
Дзе ёсць павук і пыл на ўсім ляжыць,
Дзе пісьмы палымяныя стляваюць,
І спадцішка мяняюцца партрэты,
Куды, як на магілу, ходзяць людзі,
Вяртаючыся, мыюць рукі мылам,
І змахваюць набеглую слязінку
З павек стамлёных – і ўздыхаюць цяжка...
Ды час ляціць, змяняюць ціха вёсны
Адна адну, і ружавее неба,
Мяняюцца найменні гарадоў,

І сведкаў тых падзей даўно няма ўжо,
Няма з кім плакаць, с кім успамінаць.
І спакваля ад нас сыходзяць цені,
Якіх здавён мы да сябе не клічам,
Бо іх вяртанне стра́шыла б і нас.
І неяк ранкам бачым, што забылі
Мы нават сцежкі ў дом, здавён самотны,
І, млеючы ад сораму і гневу,
Бяжым туды, ды (як у сне бывае)
Там іншае ўсё: людзі, рэчы, сцены,
І нас ніхто не знае – мы чужыя.
Мы не туды патрапілі... Бог мой!
І вось калі гарчэйшае прыходзіць:
Мы разумеем, што не здольны ўплішчыць
Мінулае ў свайго жыцця абсягі,
І нам яно амаль што так чужое,
Як нашаму суседу па кватэры,
Што тых, памерлых, мы б і не пазналі,
А тыя, з кім расстанне Бог паслаў,
Без нас цудоўна абышліся – й нават
Яно і лепей...

*1945–1950-я*

# ЗМЕСТ

## З КНІГІ «ВЕЧАР»

Любоў.......................................................................5
***(І хлопчык той, што дзьме ў дуду старанна...) ..........6
Песня апошняй сустрэчы.........................................7
***(Мне з табою п'яным весела...) ..............................8
***(Спёка. Дзьме задушны ветрык...) .........................9
***(Ты павер, не змяінае вострае джала...)..................10
Шэравокі кароль ....................................................11
Ён любіў…...............................................................12
***(А сёння не прынеслі мне пісьма...) ........................13
Надпіс на няскончаным партрэце...........................14

## З КНІГІ «РУЖАНЕЦ»

***(Я не любві тваёй прашу.) .....................................15
***(Столькі просьбаў у любай заўжды!) .......................17
Бяссонніца ...............................................................18
Споведзь ..................................................................19
***(Сэрца б'ецца роўна, мерна.)...................................20
***(Я прыйшла к паэту ў госці.) ...................................21

## З КНІГІ «БЕЛАЯ ЧАРАДА»

***(Думалі: мы жабракі, і ў нас нічога няма...) ............22
***(А я ўсміхацца перастала...)....................................23
***(У блізкасці людзей ёсць верная мяжа...)..................24
***(А дзесьці ёсць жыццё, святло і свет...) ....................25
***(Колькі раз я праклінала...)......................................26

***(Буду ціха на пагосце...) .......................................27
***(Будзем разам, мілы, разам...)..............................28
***(Бываюць напрадвесні дні такія...) ......................29
***(Выбрала сама я долю...) .......................................30
***(Доўга йшоў цераз палі ды сёлы...) ........................31
***(Яшчэ вясна загадкавая млела...) ..........................32
***(Горад згінуў...).........................................................33

## З КНІГІ «ТРЫПУТНІК»

***(Прачынацца на дасвецці...) ...............................34
***(І ў дружбы таемства з высокім...)........................35
***(У зязюлі я спытала...).............................................36
***(Смутны ў кожных сутках свой час...)....................37
***(Я вакенца не завесіла...) .........................................38
***(Чым гэты век за папярэдніх горшы?) ....................39
Ноччу .............................................................................40
***(Цячэ рака няспешна па лагчыне...)........................41
***(Калі ў журбе самазабойства...)..............................42

## З КНІГІ «ANNO DOMINI»

Петраград, 1919.........................................................43
Прадказанне...................................................................44
***(Сказаў, што мне саперніц не было.) .....................45
***(Зямной уцехай сэрца не тамі...).............................46
***(Таямнічы ты заўжды – і новы...) ..........................47
***(К табе ў няволю? Пэўна звар'яцеў?!) ...................48
***(Вее вецер лебядзіны...)...........................................49
***(Захварэць бы як след, у трызне́нні ляжаць...)......50
Лотава жонка ................................................................51

***(Небывалая восень...)...52
Эпічныя матывы...53
***(Тут і здраджана ўсё, й распрададзена...)...58
***(Саслужу табе верную службу...)...59
***(Удалося сяк-так разлучыцца...)...60
***(Я гібель наклікала мілым...)...61
Прывід...62

## З ЦЫКЛА «ТРЫСНЁГ» (ЗБОРНІК «З ШАСЦІ КНІГ»)

Муза...63
Мастаку...64
***(Месяц здольны жудой агарнуць...)...65
***(Адны глядзяцца ў позірк пачуццёвы...)...66
Барыс Пастарнак...67
Падвал памяці...69
З паэмы «Рэквіем»...70
  Уступ...70
  I. ***(Забіралі цябе на дасвецці...)...71
  IV. ***(Паказаць бы табе, насмешніцы...)...72
  VII. Прысуд...73
  IX. ***(Ужо вар'яцтва, як крылом...)...74

## СА ЗБОРНІКАЎ «БЕГ ЧАСУ» І «СЁМАЯ КНІГА»

Цыкл «Таямніцы рамяства»...75
  1. Творчасць...75
  2. ***(Нашто мне одаў звонкая пустэча...)...76
  3. Муза...77

4. Паэт ........................................................ 78
5. Чытач ........................................................ 79
6. Апошні верш ........................................................ 81
7. Эпіграма ........................................................ 83
8. Пра вершы Нарбута ........................................................ 84
9. ***(Многае яшчэ, напэўна, хоча...) ........................................................ 85
***(А ў кнігах я апошнюю старонку...) ........................................................ 86
З цыкла «У саракавым годзе» ........................................................ 88
5. ***(Я папярэджваю ўсіх вас...) ........................................................ 88
З нізкі «Месяц у зеніце» ........................................................ 89
7. З'яўленне месяца ........................................................ 89
З нізкі «Смерць» ........................................................ 90
III. ***(І той пакой, дзе я цяпер хварэю...) ........................................................ 90
[Interieur] ........................................................ 91
З «Нізкі чатырохрадкоўяў» ........................................................ 92
***(Што ні дрэва – распяты Гасподзь...) ........................................................ 92
Да вершаў ........................................................ 93
Канец Дэмана ........................................................ 94
***(Было на сэрцы адчуванне ладу...) ........................................................ 95
***(Па сваім ужо я не заплачу...) ........................................................ 96
***(Позірк за агонь мацней...) ........................................................ 97
***(...І на гэтым скразняку...) ........................................................ 98
***(Ашчадна яно і багата...) ........................................................ 99
***(Хвала лябёдкаю плыла...) ........................................................ 100
Пад Каломнай ........................................................ 101
З нізкі «Cinque» ........................................................ 102
4. ***(Знаеш сам, што не буду славіць...) ........................................................ 102

Са спаленага сшытка
(«Шыпшына Цвіце») ....................................103
6. Сон ....................................103
8. ***(Ты выдумаў мяне. Такой не знае свет...)....104
Не дасылаючы паэму ....................................105
З «Паўночных вершаў» ....................................106
1. Прадвесняя элегія....................................106
Са сшытка «Лішка» ....................................107
Прыморскі санет ....................................107
З нізкі «Вянок мёртвым» ....................................108
I. Настаўнік....................................108
IV. Памяці Барыса Пільняка ....................................109
VI. Позні адказ ....................................110
VII. Барысу Пастарнаку....................................111
XI. ***(І сэрца тое ўжо не адгукнецца...)....................................112
***(Каб усе, хто дапамогі духу...) ....................................113
З цыкла «Паўночныя элегіі»....................................114
<Другая.> Пра дзясятыя гады ....................................114
<Чацвёртая.> ***(Дык вось ён – той асенні краявід...) ....................................116
<Шостая.> ***(Ёсць тры эпохі ў нашых успамінаў.) ....................................118

У серыі «Паэты планеты», акрамя выбраных вершаў
Анны Ахматавай, таксама ёсць у продажы зборнікі такіх паэтаў, як:

Сапфо «Песні»
Францэска Петрарка «Выбраныя песні з «Канцаньерэ»
П’ер дэ Рансар «Выбраныя вершы»
Ўільям Шэкспір «Выбраныя санеты»
Ёган Вольфганг Гётэ «Выбраная паэзія»
Габрыэла Містраль «Выбраныя вершы»
Умар Хаям «Выбраныя рубаі»
Шарль Бадлер «Выбраныя вершы»
Райнэр Марыя Рыльке «Выбраная лірыка»
Фрыдрых Гёльдэрлін «Выбраная паэзія»
Генрых Гайнэ «Выбраныя вершы»
Гіём Апалінэр «Выбраная паэзія»
Эдгар По «Выбраныя вершы»
Федэрыка Гарсія Лорка «Выбранае»
Джон Кітс «Выбранае»
Рыгор Барадулін «Перавыбранае»
Дзімча Дэбялянаў «Выбранае»
Гай Валерый Катул «Выбраныя вершы»
Яраслаў Вырхліцкі «Выбраная паэзія»
Ян Каханоўскі «Выбранае»
Катры Вала «Выбраныя вершы»
Канстандзінас Кавафіс «Выбранае»
Барыс Пастарнак «Выбраная лірыка»
Аляксандр Чакс «Выбраныя вершы»
Хуан Рамон Хіменэс «Выбраная лірыка»
Юлі Таўбін «Выбранае»
Хаім Нахман Бялік «Выбраная паэзія»
Баляслаў Лесьмян «Выбраныя вершы»
Шандар Петэфі «Выбраная паэзія»
Міхай Эмінэску «Выбраная паэзія»
Ўільям Батлер Ейтс «Выбраныя вершы»
Эмілі Дыкінсан «Выбраная лірыка»
Алесь Разанаў «Перавыбранае»
Мацуа Басё «Выбраныя хайку»
Георг Тракль «Выбранае»
Сяргій Жадан «Вершы»

Рабіндранат Тагор «Гітанджалі»
Сэсар Вальеха «Выбраныя творы»
Сігб’ёрн Обстфельдэр «Выбраная паэзія»
Томас Стэрнз Эльёт «Выбраная паэзія»
Арцюр Рэмбо «Выбранае»
Нікалоз Бараташвілі «Паэзія»
Фрыдрых Шылер «Выбраная паэзія»
Умбэрта Саба «Выбраныя вершы»
Марк Валерый Марцыял «Выбраныя вершы»
Ўолт Ўітмэн «Выбраная паэзія»
Візма Бэлшавіца «Выбраная лірыка»
Мікола Зэраў «Выбраная паэзія»
Адам Міцкевіч «Выбраныя вершы»
Юсцінас Марцінкявічус «Выбраная лірыка»
Бгартрыгары «Выбраныя вершы»
Эдыт Сёдэргран «Выбраная паэзія»
Ду Фу «Выбраная лірыка»
Эрлінг Кітэльсен «Выбраная лірыка»
Ўільям Блэйк «Выбранае»
Уладзімір Маякоўскі «Паэзія»
Томас Вянцлава «Выбраныя вершы»
Гунар Экелёф «Выбраная лірыка»
Вільгельм Мюлер «Выбраная лірыка»
Анакрэон «Песні і фрагменты»
Энхедуанна «Сакральная паэзія»
Архілох «Вершы і фрагменты»
Срэчка Косавел «Выбраныя вершы»
Фернанду Песоа «Выбранае»
Канстанты Ільдэфанс Галчыньскі «Выбранае»
Дзмітро Паўлычка «Выбраныя вершы»
Захірыдзін Мухамад Бабур «Выбраныя творы»
Джордж Гордан Байран «Выбраная паэзія»
Джакама Леапардзі «Выбраныя песні»
Міхась Стральцоў «Выбраныя вершы»
Геарг Гайм «Выбраныя вершы»
Стывен Крэйн «Выбраныя вершы»
Стэйн Стэйнар «Выбраная паэзія»
Назым Хікмет «Выбраная паэзія»
Цін Уевіч «Выбраная паэзія»

**Ахматава**, А.

А95 Выбраная паэзія / Анна Ахматава; пер. з рускай Георгія Ліхтаровіча. — Мінск : Выдавец Зміцер Колас, 2020. — 128 с. (Паэты планеты).

ISBN 978-985-23-0117-6.

Анна Ахматава (1889–1966) – адна з найбольш значных рускіх паэтаў 20 стагоддзя. У 1965 годзе была ў шорт-лісце на Нобелеўскую прэмію, а ў наступным годзе аказалася на другім месцы ў намінацыі. Аднак з ідэалагічных прычын яе вершы ў СССР доўгі час не друкаваліся.

Адрасуецца шырокаму колу чытачоў.

**ББК 84(4Рус)-5**
**УДК 821.161.1-1**

Серыя «Паэты планеты»

*Літаратурна-мастацкае выданне*

Анна Ахматава

**ВЫБРАНЫЯ ВЕРШЫ**

Дызайн *Марціна Русецкага*
Адказны за выпуск *Зміцер Колас*

+12

Падпісана ў друк 20.07.2020. Фармат 60×90 $^{1}/_{32}$.
Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ул.-выд. арк. 2,15. Ум. друк. арк. 2,88.
Наклад 250 асобнікаў.

Выдавец і паліграфічнае выкананне
індывідуальны прадпрымальнік Зміцер Колас.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка
друкаваных выданняў № 1/291 ад 17.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 105-14, 220023, Мінск.